Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени М. Танка»
Исторический факультет
Учреждение образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова»
Исторический факультет

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ИСТОРИЧЕСКАЯ ГЕРМАНИСТИКА: АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ СОВРЕМЕННЫХ ИССЛЕДОВАНИЙ

***Сборник научных статей и материалов***

**Псков 2018**

УДК 811.11-112(045):94(430)(045)
ББК 80.4-03я431+63.3(4Гем)я431
И90

Авторы идеи и составители: декан исторического факультета БГПУ имени М. Танка, кандидат исторических наук, доцент **А.В. Касович**; декан исторического факультета ВГУ имени П.М. Машерова, доктор исторических наук, профессор **В.А. Космач**; заведующий кафедрой истории Беларуси и славянских народов БГПУ имени М. Танка, кандидат исторических наук, доцент **А.Ф. Великий**; доцент кафедры всеобщей истории и методики преподавания истории БГПУ имени М. Танка, кандидат исторических наук, доцент **И.И. Ковяко**

**И90** **Историческая германистика: актуальные проблемы современных исследований** : сб. научных статей и материалов / сост.: А.В. Касович, В.А. Космач, А.Ф. Великий, И.И. Ковяко. – Псков: ООО «ЛОГОС», 2018. – 398 с.
ISBN

Сборник составлен по материалам Международной научно-теоретической конференции, посвященной памяти доктора исторических наук, профессора Г.А. Космача и в связи с 65-летием со дня его рождения (1953–2016 гг.), проходившей 21–22 июня 2018 г. в БГПУ имени М. Танка (г. Минск).

**УДК 811.11-112(045):94(430)(045)**
**ББК 80.4-03я431+63.3(4Гем)я431**

**ISBN**

© БГПУ, 2018
© ВГУ имени П.М. Машерова, 2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



КОСМАЧ ГЕННАДИЙ АРКАДЬЕВИЧ
(1953–2016 гг.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

21. An Immigrant Nation : United States regulation of immigration, 1798-1991. – Wash., 1991. – 41 с. [Electronic resource]. – Mode of access: http://hdl.handle.net/2027/mdp.39015025288732. – Date of access: 02.03.2018.
22. Бирюков, В.И. Китайцы в США и американо-китайские отношения на современном этапе / В.И. Бирюков. – М. : Наука, 1983. – 141 с.
23. An Act to Inaugurate Certain Treaty Stipulations Relating to Chinese : Act of May 6, 1882. // U.S. Statutes at Large. – 1883. – Vol. 22. – Chap 126. – 47th Congress. – 1st Session. [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.loc.gov/law/help/statutes-at-large/47th-congress/session-1/c47s1ch126.pdf. – Date of access: 02.03.2018.


## ДЗЕЙНАСЦЬ ПАВЕРАЧНЫХ КАМІСІЙ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ ЎРАДА Ў БЕЛАРУСІ Ў 60-Я ГГ. XIX СТ.


**С.А. Талмачова, г. Мінск**



*Паверачныя камісіі ствараліся на тэрыторыі Беларусі для праверкі дакладнасці вылічэння аброчнай павіннасці сялян у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і частцы Віцебскай губ. Эфектыўнасць дзейнасці камісій напрамую залежала ад кампетэнтнасці членаў, што не заўсёды атрымлівалася. Імкненне мясцовых улад хутка закончыць работу па складанні і ўвядзенні выкупных актаў прыводзіла да шматлікіх памылак. Пры гэтым вынікам работы камісій у цэлым стала значнае памяншэнне плацяжоў сялян за зямлю.*



*Ключавыя словы: Беларусь, аграрная палітыка, аграрная рэформа, паверачныя камісіі, сяляне, міравыя пасрэднікі, пазямельнае ўладкаванне.*


***

Аграрная палітыка ўрада Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі ў 60-я гг. XIX ст. мела свае асаблівасці. Перашапачаткова гэта было звязана з традыцыйнымі формамі землекарыстання сялян Беларусі – абшчыннай і падворнай. Таму заканадаўства 19 лютага 1861 г. прадугледжвала і розныя ўмовы надзялення іх зямлёй на падставе двух “Мясцовых палажэнняў”: 1) у Магілёўскай і частцы Віцебскай губ. сяляне надзяляліся зямлёй праз абшчыну, 2) у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і латгальскіх паветах Віцебскай губ. – падворна [11]. На падставе “Мясцовага палажэння” для апошніх чатырох губерняў ва ўстаўных граматах спачатку вызначалася колькасць павіннасцей на карысць памешчыка з кожнага сялянскага ўчастка. Затым іх памер падлягаў яшчэ праверцы дзеля канчатковага вызначэння належнай суразмернасці сялянскіх павіннасцей з асаблівымі мясцовымі ўмовамі. Законам 1861 г. гэтая праверка ўскладалася на асаблівыя паверачныя камісіі [11].

У сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. законам ад 1 сакавіка 1863 г. у губернях Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і чатырох паветах Віцебскай аднначасова з праверкай павіннасцей адбываўся і перавод на выкуп угоддзяў, якія знаходзіліся ў карыстанні сялян, з паніжэннем на 20 % нормы выкупных плацяжоў [13]. Па даручэнні Аляксандра II міністр

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

унутраных спраў распрацаваў праект новых правілаў аб складзе і парадку дзеянняў паверачных камісій з улікам іх новых абавязкаў. Пасля разгляду Галоўным камітэтам аб уладкаванні сельскага стану 9 красавіка 1863 г. правілы былі зацверджаны Аляксандрам II [14]. У адпаведнасці з імі ў кожным павеце названых губерняў было створана па адной паверачнай камісіі. Яны складаліся з двух членаў ад урада і міравога пасрэдніка таго ўчастка, у якім праводзілася праверка павіннасцей і вызначэнне выкупных пляцяжоў. Адзін член ад урада камісіі прызначаўся міністрам унутраных спраў, другі – міністрам фінансаў, старшынёй камісіі станавіўся член ад МУС. Пры гэтым у асаблівай інструкцыі, складзенай Віленскім генерал-губернатарам, адзначалася, што ў выпадку, калі ў павеце быў толькі адзін міравы пасрэднік, то ён удзельнічаў у рабоце паверачнай камісіі на тэрыторыі ўсіх участкаў [20, с. 28]. Такое ўдакладненне было выклікана тым, што ў 1863 г. у сувязі з паўстаннем пачаўся працэс поўнай зменены кадравага складу міравых пасрэднікаў, і ў некаторых участках пэўны час пасады заставаліся вакантнымі.

Аднак палітычныя абставіны патрабавалі хуткага вырашэння пазямельнага ўладкавання сялян. Таму ў адпаведнасці з законам ад 22 кастрычніка 1863 г. пры неабходнасці і наяўнасці чыноўнікаў у паветах пачалі ствараццa па дзве і нават па тры паверачныя камісіі [16]. Як сведчаць афіцыйныя даныя за 1864 г., у пачатку года ў беларускіх паветах Віленскай губерні дзейнічалі па адной камісіі. Іх члены былі прызначаны ў 1863 г., і ўсе яны, за выключэннем старшыні камісіі Лідскага павета, былі праваслаўнага веравызнання [10, с. 151-163]. Але ўжо да ліпеня 1864 г. былі ўтвораны па 2 паверачныя камісіі ў кожным павеце Віленскай губерні, акрамя Дзісненскага. Па дзве камісіі працавалі і ва ўсіх паветах Мінскай губерні [3, с. 87-88].

Паверачныя камісіі не разглядалі памер баршчыны, а праводзілі праверку адпаведнага аброку з сялян з мэтай вызначэння выкупных плацяжоў. Таму пры праверцы ўсе павіннасці вызначаліся абавязкова толькі ў грашовым вылічэнні ў тым памеры, у якім сялянам прыходзілася б уносіць выкупныя плацяжы.

Паводле закону ад 9 красавіка 1863 г. праверка павіннасцей вызначалася наступным чынам. Губернская па сялянскіх справах прысутнасць да пачатку работы камісій размяркоўвала на разрады ўчасткі, што знаходзіліся ў карыстанні сялян, у адпаведнасці з іх вартасцю і арэнднымі цэнамі. Вышэйшаму разраду адпавядаў грашовы аброк у 3 руб. за дзесяціну зямлі, а ніжэйшаму – 60 к. у Мінскай губ., у Віленскай і Гродзенскай – 80 к., а ў Ковенскай і частцы Віцебскай губ. – 1 руб. за дзесяціну. Паміж гэтымі двума крайнімі разрадамі губернская па сялянскіх справах прысутнасць вызначала пераходныя разрады з аднастайнымі прамежкамі. Законам прадугледжвалася, што калі гэтыя прамежкі будуць складаць па 20 кап., то ў Ковенскай і частцы Віцебскай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

губерняў атрымаецца 11, у Віленскай і Гродзенскай – 12, а ў Мінскай губ. – 13 разрадаў. У выніку плацяжы вылічаліся б наступным чынам: 1-ы – 3 руб. за дзесяціну, 2-гі – 2 руб. 80 к., 3-ці – 2 руб. 60 к. за дзес. і г. д., а 11-ы – 1 руб., 12-ты – 80 к. і 13-ты – 60 к. за дзес. Пры гэтым камісіям давалася права вызначаць яшчэ меншыя плацяжы ў тых выпадках, калі землі «находятся в исключительном, невыгодном положении» па якасці глебы ці аддаленасці палёў [14, с. 310–311]. Аднак у інструкцыі паверачным камісіям, складзенай Віленскім генерал-губернатарам, прапанавалася падзяліць землі названых губерняў не на 13, а на 10 разрадаў з прамежкамі паміж сям'ю вышэйшымі разрадамі ў 30 кап. і ў трох ніжэйшых – у 20 кап., дадавалася і табліца размеркавання. У ёй прыводзіліся разрады з указаннем якасці і ўрадлівасці глебы і кошту за дзесяціну зямлі па прыведзеных вышэй трох групах губерняў. Пры гэтым вышэйшы і ніжэйшы кошт за дзесяціну застаўся тым жа, што і ў законе ад 9 красавіка 1863 г. [20, с. 43].

План дзейнняў паверачных камісій вызначаўся мясцовымі губернскімі па сялянскіх справах прысутнасцямі. Для яго складання, а таксама для ўзгаднення агульнага кірунку дзейнасці ў розных паветах губернская прысутнасць запрашала на свае пасяджэнні старшынь павятовых паверачных камісій і па аднаму міравому пасрэдніку ад кожнага павета, па выбары старшыні прысутнасці (губернатара). Затым губернская па сялянскіх справах прысутнасць давала падрабязнае тлумачэнне паверачным камісіям: якімі крытэрыямі яны павінны былі карыстацца пры аднясенні ўчасткаў да аднаго ці іншага з усталяваных разрадаў. Пры гэтым крытэрыі вызначаліся пераважна па агульным характары ўчасткаў.

Са свайго боку, губернская прысутнасць павінна была пастаянна сачыць за работай камісій, накіроўваць і ўзгадняць іх дзеянні, вырашаць непаразуменні. У выпадку неабходнасці яна звярталася за тлумачэннямі ў Міністэрства ўнутраных спраў. Гэта рабілася для “справядлівага і ўраўняльнага” вызначэння павіннасцей у межах губерні, якія адпавядалі выкупным плацяжам сялян. Губернскія па сялянскіх справах прысутнасці пастаянна павінны былі ўзгадняць паміж сабой усе дзеянні па праверцы павіннасцей і памеры выкупу [5, с. 61].

Паверачная камісія ў прысутнасці памешчыка прад'яўляла сялянам устаўную грамату і адначасова абвяшчала ўмовы выкупу ўгоддзяў. Затым выслухоўваліся заўвагі сялян і памешчыка аб якасці глебы і выгадах размеркавання ў параўнанні з суседнімі маёнткамі, аб мясцовых арэндных цэнах на землі рознай якасці і аб тых асаблівасцях ці выключных абставінах, у якіх знаходзіўся ўвесь маёнтак ці некаторыя падворныя ўчасткі. Потым камісія ўдакладняла ў сялян, якія канкрэтна ўгоддзі і ў якім памеры яны меркавалі набыць. Пры неабходнасці збіраліся дадатковыя звесткі, аглядаліся землі, прадстаўленыя сялянам. У выніку камісія складала акт, дзе ўказваліся разрад, прычыны аднясення да яго сялянскіх

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

земляў, памер надзелу, яго адвод і г. д. Затым акты ішлі на разгляд і заключэнне губернскай па сялянскіх справах прысутнасці, якая разам з усімі неабходнымі дакументамі перадавала іх у Галоўную выкупную установу, а тая давала дазвол на выкуп пры капіталізацыі ў 6 % гадавых.

На пастановы губернскай прысутнасці дазвалялася прыносіць скаргі міністру ўнутраных спраў толькі ў тых выпадках, калі рашэнне прысутнасці не было аднагалосным. Такія дакументы разглядаліся ў Савеце міністра, а пасля зацвярджэння апошняга абскарджаныя пастановы губернскай прысутнасці зацвярджаліся ці вярталіся для належных выпраўленняў.

Сяляне ўскладалі вялікія спадзяванні на вынікі работы паверачных камісій. У красавіку 1863 г. міравы пасрэднік 2-га ўчастка Барысаўскага павета Мінскай губ. П.Сямеўскі дакладаў губернатару А.Кажэўнікаву, што сяляне ўчастка вельмі чакалі пачатку дзеянняў паверачнай камісіі. Па іх меркаванні, яна паменшыць аброк адносна ўстаўных грамат. Сяляне былі перакананы, што новая плата пачнецца з моманту праверкі названых дакументаў. Пры гэтым было немагчымым “переубедить крестьян в том, что прежний размер оброка по уставной грамоте ... должен будет остаться и после поверки повинностей поверочною комиссиею до окончательного утверждения выкупного акта в Петербурге, а новый размер оброка только определит выкупные платежи”. Сяляне спасылаліся на апублікаваныя цыркуляры генерал-губернатараў, якія абяцалі палягчэнне іх становішча ў выніку працы паверачных камісій [9, арк. 13–13 адв.].

Як ужо адзначалася, паверачныя камісіі ў адпаведнасці з законам ад 9 красавіка 1863 г. ствараліся толькі для праверкі вызначаных па ўстаўных граматах павіннасцей. Аднак Віленскі генерал-губернатар без узгаднення з цэнтральнымі ўладамі 14 жніўня 1863 г. выдаў цыркуляр, які пашыраў кампетэнцыю названых устаноў. З гэтага часу ім дазвалялася выпраўлять устаўныя граматы і адносна сялянскага надзелу – пры памылках ва ўказанні колькасці зямлі, пры пазбаўленні сялян сенажацей і выганаў ці калі не былі паказаны няўдобіцы і інш. [20, с. 63–64].

У цэлым умовы праверкі сялянскага надзелу не былі дакладна акрэслены, а агульныя ўказанні Віленскага генерал-губернатара адрозніваліся не толькі недакладнасцю, а часам і процілегласцю. Гэта прыводзіла да таго, што паверачныя камісіі кіраваліся ў рабоце сваімі меркаваннямі, якія не былі своечасова ўзгоднены і ўдакладнены ў адзіным кірунку, як прадугледжвалася правіламі аб рабоце паверачных камісій ад 9 красавіка 1863 г. Таму ў шэрагу выпадкаў недакладнасці вымярэння і праверкі колькасць зямлі ў сялян у большасці выпадкаў у выкупных актах паказвалася няправільна, а межы надзелу ці ўвогуле не вызначаліся, ці калі і вызначаліся, то з памылкамі. Пры гэтым губернскімі па сялянскіх справах прысутнасцямі такія памылкі не заўважаліся, і выкупныя акты зацвярджаліся канчаткова. Між тым пры



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адмежаванні сялянскага надзелу “в натуре” вельмі часта аказвалася, што паказаны ў выкупных дакументах за сялянамі надзел не адпавядае іх сапраўднаму карыстанню. У такіх выпадках пры прывядзенні выкупнога акта ў выкананне прыходзілася ці адразаць частку зямлі ў сялян, ці дадаваць ім частку фальваркавай зямлі памешчыка [18, арк. 38].

Праверачныя работы праводзіліся ў шэрагу выпадкаў у спешным рэжыме. У 1868 г. Віленскі генерал-губернатар А.Патапаў адзначаў, што “в Гродненской губернии, в коей работы сии производились особенно поспешно и официально названы были оконченными в 1864 г., в настоящее время, хотя выданы крестьянам данныя по 2 000 имениям, но отграничение их надела в натуре сделано только в 150 имениях”. Прычынай А.Патапаў назваў “несходства выкупных актов с действительным крестьянским владением” [18, арк. 38].

Некаторыя камісіі былі недастаткова кампетэнтнымі ў асаблівасцях мясцовых пазямельных адносін, таму што пераважная большасць іх членаў была выклікана з унутраных губерняў Расійскай імперыі. У адозве да міністра ўнутраных спраў А.Патапаў у чэрвені 1868 г. адзначаў: “При смене, во время вооруженнаго мятежа, всех прежних мировых посредников из местных дворян-помещиков, некогда и нельзя было быть разборчивым в сформировании новаго состава. Естественно, что личный состав поверочных комиссий и вообще мировых учреждений набран был весьма разнокалиберный и неподготовленный к делу. При таком составе, вместо назначения каждому точно ограниченнаго законом места и круга действий, сделано было им лишь общее воззвание к политической деятельности и к водворению русских начал, без всякого разумнаго указания им меры и согласования их действий. ...При разнокалиберности и неподготовленности личного состава, при отсутствии инструкций, надзора и согласования свыше, произошли крайнее разнообразие и произвольность действий низших исполнительных инстанций, ведение каждым дела по своей личной мерке, допускавшее в некоторых полный простор необдуманности и увлечений, в особенности при шаткости и эластичности заменивших закон административных правил местной власти» [18, арк. 3 адв. – 5].

Віленскі генерал-губернатар М.Мураўёў імкнуўся да паскарэння пазямельнага ўладкавання былых часоваабавязаных сялян. Таму ён выдаваў цыркуляры і распараджэнні, якія не ўзгадняў з цэнтральнымі ўладамі. У прыватнасці, у адпаведнасці з арт. 13 правілаў ад 9 красавіка 1863 г., кожная губернская па сялянскіх справах прысутнасць павінна была распрацаваць сваю інструкцыю паверачным камісіям губерні. Аднак М.Мураўёў замяніў іх агульнай інструкцыяй для ўсяго краю з некаторымі адступленнямі ад асноўных кірункаў, пазначаных у правілах 9 красавіка 1863 г. У прыватнасці, у п. 1 аддзела I адзначалася, што “оценке подлежат те земли, которыя состояли в пользовании крестьян

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

при обнародовании указа 1 марта 1863 г.” замест “…земли, состоявшей в пользовании при обнародовании Положения 19 февраля 1861 г.”, як гэта вынікала з названых Палажэння і ўказа [18, арк. 8–9]. Інструкцыя была складзена ў чэрвені 1863 г. і адразу дана для кіраўніцтва паверачным камісіям, якія пачалі сваю дзейнасць з жніўня 1863 г. Пры гэтым у МУС аб ёй і іншых распараджэннях мясцовай адміністрацыі стала вядома толькі пасля паступлення скаргаў на рашэнні камісій [18, арк. 9–10].

На работу па праверцы павіннасцей і вызначэнні памераў выкупных плацяжоў адводзілася два гады [5, с. 62]. 19 красавіка 1866 г., у адпаведнасці з палажэннем Галоўнага камітэта па ўладкаванні сельскага стану, генерал-губернатару Паўночна-Заходняга краю было прапанавана пасля заканчэння работы паверачных камісій ліквідаваць іх. У выпадку неабходнасці правядзенне новай праверкі ці выпраўленне выкупных актаў па заўвагах губернскай па сялянскіх справах прысутнасці і Савета міністра ўнутраных спраў ускладалася на мясцовыя з’езды міравых пасрэднікаў [17]. У некаторых мясцовасцях (напрыклад, у Гродзенскай губ.) праверка была скончана ў адведзеныя законам два гады, а ў іншых працягвалася больш доўгі тэрмін. Так, толькі 15 сакавіка 1868 г. Віленскі генерал-губернатар дакладаў міністру ўнутраных спраў аб закрыцці паверачных камісій у Рэчыцкім і Пінскім паветах Мінскай губ. [19, арк. 63].

Дзейнасць паверачных камісій пры складванні выкупных актаў у 1865–1866 гг. характарызавалася найбольш значнымі саступкамі патрабаванням сялян пры вызначэнні памераў надзела, яго ацэнцы, усталяванні разрадаў угоддзяў і іх развярстанні. У выніку дзейнасці камісій сялянам вярнулі частку зямлі, якая была адрэзана пры складванні выкупных актаў у 1863–1865 гг. [6, с. 184].

Так, па даных справаздачы Віленскага губернатара, на 1 студзеня 1867 г. праверачнымі камісіямі было складзена і прадстаўлена ў губернскую па сялянскіх справах прысутнасць 2 188 выкупных актаў. У сувязі з гэтым праверачныя камісіі былі ў гэтай губерні ліквідаваны ў канцы 1866 г. У іншых губернях, за выключэннем Мінскай, складанне і зацвярджэнне выкупных актаў было скончана да канца 60-х гг. XIX ст. У Мінскай губ. гэты працэс зацягнуўся. Да 1 студзеня 1870 г. Галоўнай выкупной установай і губернскай па сялянскіх справах прысутнасцю было канчаткова зацверджана 16 043 выкупныя акты. У выніку памер сялянскіх зямель узрос, а выкупны кошт за яе значна зніжаны. З аналізу 8 472 выкупных здзелак, праведзенага П.А.Зайанчкоўскім, вынікае, што колькасць надзельнай зямлі павялічылася з 3 154 143 да 3 913 754 дзес., альбо на 759 611 дзес. (на 24%) у параўнанні з зямельнымі надзеламі па ўстаўных граматах [4, с. 222-224]. Акрамя таго, цыркулярам М.М.Мураўёва ад 24 ліпеня 1863 г. паверачныя камісіі павінны былі ўключаць у выкупныя акты і сервітутныя землі (тыя, якія да адмены прыгону знаходзіліся ў агульным карыстанні сялян і памешчыкаў – ляс-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ныя ўгоддзі, выпасы, выганы і інш.) ці схіліць памешчыкаў замяняць сервітуты на землі, прыдатныя для сялянскіх сенажацей і пашаў [1, с. 275-276]. На мясцовыя ўстановы па сялянскіх справах ускладаўся абавязак замацаваць, з унясеннем у выкупныя дакументы, за сялянамі ўсё тое, чым яны карысталіся да адмены прыгону на землях і ў угоддзях памешчыкаў, у тым ліку і розныя віды пашавых сервітутаў. Аднак паверачныя камісіі, якія займаліся праверкай, удакладненнем і выпраўленнем устаўных грамат, не заўсёды дакладна вызначалі ў дакументах такія ўгоддзі [2, с. 4-5]. Прычынамі былі, як ужо вызначалася вышэй, па-першае, спешнайсць работ, а па-другое – недастатковая кампетэнтнасць некаторых камісій у вырашэнні такога пытання, таму што пераважная большасць членаў паверачных камісій была выклікана з унутраных губерняў Расійскай імперыі, дзе ўвогуле ніколі не існавала такога паняцця як “сервітутнае права”, што было адной з асаблівасцей аграрных адносін у Паўночна-Заходнім краі. Недакладнасці ў вызначэнні паверачнымі камісіямі сервітутаў у выкупных дакументах сталі прычынай напружанасці адносін паміж сялянамі і памешчыкамі, бо апошнія не маглі ў поўнай меры распараджацца сваёй зямельнай уласнасцю. Праблема сервітуту абмяркоўвалася на пасяджэннях Дзяржаўнай думы, але так і не была канчаткова вырашана [21].

У Магілёўскай губ. і 8 паветах Віцебскай пазямельнае ўладкаванне былых памешчыцкіх сялян праходзіла інакш. Спыненне абавязковых адносін паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі адбывалася тут на падставе ўказа Аляксандра II ад 2 лістапада 1863 г. пераводам устаўных грамат у выкупныя акты [15]. Тут складаная праверка павіннасцей для вызначэння памераў выкупных плацяжоў была заменена простым засведчаннем у правільнасці ўстаўных грамат. Яно ўскладалася на з’езды міравых пасрэднікаў, якім давалася права выпраўлення няправільна складзеных грамат як адносна надзелу, так і павіннасцей. Для такога “удостоверения” з’езд выклікаў упаўнаважаных ад сялян пэўных паселішчаў і прад’яўляў ім устаўную грамату. Калі ўпаўнаважаныя не згаджаліся з правільнасцю граматы, то з’езд даручаў міраваму пасрэдніку пасля дазнання на месцы зрабіць у грамаце неабходныя выпраўленні. У некаторых выпадках патрабаваліся тлумачэнні таксама і ад уладальніка ці яго паверанага [5, с. 63–64]. З’езд міравых пасрэднікаў складаў пратакол па выніках разгляду ўстаўной граматы. У ім выкладаліся меркаванні сялян і заключэнні з’езда адносна яе правільнасці і канчатковага памеру выкупных плацяжоў. Копіі з пратаколу разам з устаўной граматай перадаваліся міравому пасрэдніку, які складаў выкупны акт у адпаведнасці з пратаколам. Акт прад’яўляўся памешчыку і сялянам, а затым перадаваўся члену ад урада з’езда міравых пасрэднікаў, які сведчыў дакумент і накіроўваў у губернскую па сялянскіх справах прысутнасць. Адсюль разам з заключэннем

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прысутнасці акт ішоў у Галоўную выкупную ўстанову, якая давала дазвол на выкупную пазыку. Пасля гэтага выкупны акт прыводзіўся ў выкананне ў адпаведнасці з “Положением о выкупе” [5, с. 64; 12; 15].

Такім чынам, функцыі паверачных камісій за час іх існавання паступова пашыраліся. Створаныя спачатку для праверкі дакладнасці вылічэння аброчнай павіннасці сялян, камісіі набылі і палітычнае значэнне. Вынікі іх дзейнасці звязваліся з поспехамі падаўлення паўстання 1863–1864 гг. Іх эфектыўнасць напрамую залежала ад кампетэнтнасці членаў, аднак гэтая ўмова далёка не заўсёды магла быць задаволена. Імкненне мясцовых улад хутка закончыць работу па складанні і ўвядзенні выкупных актаў прыводзіла да шматлікіх памылак. Гэта стала прычынай скаргаў і павелічэння напружанасці ў беларускай вёсцы.

### Літаратура і крыніцы:


1. Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края : в 2 ч. / Изд. при Муравьев. музее в г. Вильне. – Вильна, 1913-1915. – Ч. 1: Переписка по политическим делам гражданского управления с 1 января 1862 по май 1863 г. / Сост. А.И. Миловидов. – 1913. – [2], LXVI, 464 с., 2 л. ил.
2. Войниллович, Э.А. Об упразднении пастбищных сервитутов и уничтожении черезполосности крестьянских земель с фольварковыми в западных губерниях : Записка Э.А. Войнилловича, [вице-пред. Мин. о-ва сел. хоз[-ва]]. – Минск: [Б. и.], 1899. – 12 с.
3. Жытко, А.П., Талмачова, С.А. Міравыя пасрэднікі /А.П.Жытко, С.А.Талмачова //Дзяржаўнае кіраванне і грамадскае самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.): вучэб.-метад. дапам. / А.П. Жытко [і інш.]; пад агул. рэд. А.П. Жытко. – Мінск: БДПУ, 2017. – 320 с.
4. Зайончковский, П.А. Отмена крепостного права в России / П.А. Зайончковский. – 3-е изд. – М.: Просвещение, 1968. – 368 с.
5. Катаев, М.М. Местные крестьянские учреждения 1861, 1874 и 1889 гг. : (Ист. очерк их образования и норм деятельности) : Ко дню пятидесятилет. годовщины освобождения крестьян от крепостной зависимости 19 февр. 1911 г.: в 3 т. / Сост. М.М. Катаев. – СПб.: Зем. отд. М-ва вн. дел, 1911-1912. – Ч. 2. – 1911. – [2], 127 с.
6. Комзолова, А.А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А. Комзолова. – М. : Наука, 2005. – 380, [3] с.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 242. Воп. Спр. 87.
8. НГАБ. – Фонд 242. Воп. 1. Спр. 172.
9. НГАБ. – Фонд 242. Воп. 1. Спр. 88.
10. Памятная книжка Виленской губернии на 1864 год / составлена, с разрешения начальства, Виленским губернским статистическим комитетом. – Вильно : тип. А. Сыркина, 1864. – Вильно, 1864. – С. 151–163.
11. Полное собрание законов Российской империи (далее – ПСЗРИ). – Собр. 2-е. – Т. 36. – 1861. – Отд. 1. – № 36665.
12. ПСЗРИ. – Собр. 2-е: в 55 т. – Т. 36. – 1861. – Отд. 1. – № 36659.
13. ПСЗРИ. – Собр. 2-е: в 55 т. – Т. 38. – 1863. – Отд. 1. – № 39337.
14. ПСЗРИ. – Собр. 2-е: в 55 т. – Т. 38. – 1863. – Отд. 1. – № 39463.
15. ПСЗРИ. – Собр. 2-е: в 55 т. – Т. 38. – 1863. – Отд. 1. – № 40172.
16. ПСЗРИ. – Собр. 2-е: в 55 т. – Т. 38. – 1863. – Отд. 2. – № 40145.
17. ПСЗРИ. – Собр. 2-е: в 55 т. – Т. 41. – 1866. – Отд. 1. – № 43212.
18. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА). – Фонд 1291. Воп. 33. 1868 г. Спр. 34.


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

19. РДГА. – Фонд 1291, оп. 33, 1865 г., д. 531.
20. Сборник правительственных распоряжений по устройству быта крестьян-собственников в Северо-западном крае. – Вильна : Тип. Штаба Вилен. воен. окр., 1864. – [2], VI, 150 с.
21. Талмачова, С. Праблема сервітуту на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / С.Талмачова // Беларусь, Нясвіжскі край і Эдвард Вайніловіч: матэрыялы навук.-практ. канф., г. Нясвіж, 26 жніўня 2016 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А.А.Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Медысонт, 2016. – . 185–205.

## РЕФОРМА НАЛОГОВОЙ СИСТЕМЫ США 2017 г.

**А.В. Тищенко, г. Минск**

*Статья посвящена реформе налоговой системы США. Автор констатирует основные проблемы налоговой системы, анализирует ход принятия администрацией Д. Трампа налоговой реформы. Рассмотрены положительные и отрицательные стороны реформы. На основании анализа статистики и фактических данных автор приходит к выводу о неоднозначности принятого закона.*

*Ключевые слова: президентство Д. Трампа; налоговая реформа в США; американская налоговая система.*

***

Реформа налоговой системы была одним из главных предвыборных обещаний Д. Трампа. Главным мотивом к проведению реформы стали высокие налоги и несовершенство налогового законодательства. Крупные корпорации и богатые американцы использовали юридические лазейки для того чтобы платить меньше налогов. Это ставило крупный бизнес и простых американцев в неравные условия.

Д. Трамп придерживался традиционной для республиканцев идеи экономики предложения, согласно которой снижение налоговых ставок для граждан приведет к росту их доходов. Однако, в очередной раз предлагалось начать с фактической помощи и без того богатым американцам. По мнению Д. Трампа, снижение налогов для бизнеса должно стимулировать инвестиции, что приведет к ускорению экономического роста, большей занятости и повышению заработной платы.

Подобная политика уже проводилась в прошлом. Теория экономики предложения – один из ключевых элементов неоконсервативной политики, популярной в 1980-е годы на Западе. Идеология неоконсерватизма нашла свое отражение в политике М. Тетчер в Великобритании, Г. Коля в Германии. В США этой политики придерживалась администрация республиканца Р. Рейгана, с именем которого связана крупная налоговая реформа. В 1986 году им был принят закон о реформе налогов (Tax Reform Act of 1986) [1]. Несмотря на снижение уровня инфляции с 12,5% в 1980 до 4,5% в 1988 году, и рост экономики, результатом политики

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ